14 января, четверг
1999 г.
N2 (47)

Приложение - программа ТВ.
Цена - 10000 руб.

Биржа информации

Цитата недели

"Долго тащить счастливчика на закорках надоедает и Фортуне."

Бальтасар Грасиан

до окончания полномочий президента согласно Конституции 1994 г.

осталось 188 дней

Паслы прылятаюць

Паслы краінаў Еўрасаюза вяртаюцца ў Мінск у нядзелю, 17 студзеня. Пра гэта паведамілі ў нямецкай амбасадзе.

Нагадаем, што паслы Вялікабрытаніі, Германіі, ЗША, Японіі і іншых заходніх краінаў "на няпэўны тэрмін" пакінулі Беларусь 22 чэрвеня мінулага года. Прычынай паслужыла высяленне беларускімі уладамі замежных дыпламатаў з іх рэзідэнцыяў у комплексе "Драздны". Скандал набыў міжнародныя маштабы, але толькі напрыканцы мінулага года беларускія ўлады пайшлі на ўступкі і паабяцалі дыпламатам "шырокі доступ" у Драздны. Прэзідэнт Лукашэнка паспяшаўся абвесціць, што паслы Еўрасаюза вернуцца ў Беларусь да старога Новага года. Аднак дыпламаты плануюць з'явіцца ў Мінску толькі 17 студзеня. Чакаецца, што яны прыляцяць рэйсам авіякампаніі "Люфтганза" ў 13 гадзінаў.

Алесь ДАШЧЫНСКІ

Прокуратура протестует

Узнав из газетных публикаций о планируемой в ближайшее время сессии Верховного Совета и Конгрессе демократических сил, прокуратура Беларуси выступила с заявлением.

Прокуратура считает, что сессия Верховного Совета 13-го созыва, *"на которой планируется развернуть работу по организации досрочных выборов президента Республики Беларусь"*, а также Конгресс демократических сил, *"который будет сопровождаться несанкционированными пикетами и митингами"*, не соответствуют Конституции Беларуси и действующему законодательству. *"Такие действия могут расцениваться не иначе как попытка захвата государственной власти неконституционными путями, намерением дестабилизировать ситуацию в обществе, спровоцировать массовые беспорядки"*, - говорится в заявлении.

Авторы заявления предупреждают, что *"организация и участие в таких противоправных действиях повлечет за собой как криминальную так и административную ответственность"*, и призывают граждан республики *"не поддаваться на провокационные обращения организаторов таких мероприятий, воздержаться от участия в их проведении"*.

БелаПАН

Адзінага кандыдата ў прэзідэнты?

Каардынацыйны камітэт "Гродзенская ініцыятыва", у складзе якога 32 грамадскія і палітычныя арганізацыі, звярнуўся да ўсіх рэгіянальных дэмакратычных аб'яднанняў з прапановай не ўдзельнічаць у выбарах у мясцовыя Саветы, а таксама падтрымаць ініцыятыву ВС аб правядзенні прэзідэнцкіх выбараў сёлетняй вясной. Камітэт лічыць, што дэмакратычныя сілы павінны выставіць на выбары агульнага кандыдата.

С.А.

100 ТЕЛЕФОННЫХ ЗВОНКОВ ГРОДНЕНЦАМ

"НЕТ К НЕМУ ДОВЕРИЯ"

В минувшее воскресенье белорусским гражданам стало известно о том, что Верховный Совет тринадцатого созыва принял решение о проведении 16 мая нынешнего года выборов президента Беларуси. Известный телевизионный "камикадзе" товарищ Зимовский, вопреки неоднократным заявлениям своего патрона об отсутствии серьезного влияния на белорусское общество со стороны легитимного парламента, рискнул разрекламировать данное решение на всю страну. Благодаря оригинальной форме подачи рекламного материала, уже в понедельник событие обсуждалось многими из нас на работе, в общественном транспорте и за семейным столом. В одной знакомой семье пришлось уговаривать девятилетнего мальчика покинуть взрослых на время обмена впечатлениями о сказанном ведущим самой аналитической программы на БТ, "потому что этот седой дядя говорил о людях очень некрасивые слова". Политические "бомжи" и "импотенты" - не самые из них неприличные, и их можно напечатать в газете.



Таким образом, с легкой руки "резонатора", который, эпатируя публику, привлекает внимание к наиболее значимым событиям в недоразвитой общественной жизни нашей страны, мысль о плебисците, назначенном на май 1999 года, прочно обосновалась в сознании белорусских граждан. "БИ", восприниимая выступление А.Зимовского как начало предвыборной кампании президента Лукашенко, немедленно произвела замер общественного мнения и спросила вас, дорогие гродненцы:

За кого бы вы голосовали, если бы в ближайшее время состоялись выборы президента Беларуси?

ЗА ЛУКАШЕНКО - 34 %

Лидер нашего опроса традиционно пользуется доверием значительной части пенсионеров и сторонников интеграции с Россией: *"Мне импонирует его союз с Россией и отношение к пенсионерам. Мы с мужем на прошлых выборах голосовали за Кебича, а теперь верим только Лукашенко"*. Некоторые из данной группы опрошенных голосовали бы за нынешнего президента только потому, что *"ему нет альтернативы"*. Или: *"Потому что я больше никого не знаю"*. Как видно, такие объяснения нельзя воспринимать, как способствующие осознанному выбору. Но президентская кампания только началась и, будем надеяться, что товарищ Зимовский просветит своих зрителей и расскажет о каждом из кандидатов персонально. Даже в среде сторонников президента наметился серьезный раскол. Дело в том, что последние интеграционные порывы А. Лукашенко вызывают у некоторых ощущение дискомфорта: *"Лукашенко - неплохой президент. Единственное плохо, что он связался с этой Россией и теперь будет ей помогать, но все равно я голосовал бы за него"*.

ЗА ЧИГИРЯ - 13 %

Вернувшийся достаточно недавно в белорусскую политику экс-премьер Михаил Чигирь ассоциируется у гродненцев с периодом стабильности и относительного благополучия. Видимо, поэтому ему удалось занять второе место в нашем президентском рейтинге: *"При нем мы жили намного лучше, и он многое хотел в нашем государстве исправить, но Лукашенко ему не дал, к сожалению"*. Для некоторых фамилия Чигирь помимо успешного премьерства означает следующие качества: *"Это опытный и честный руководитель. Даже Лукашенко, уволив его, не смог предъявить ему никаких претензий. Кроме того, он имеет большие связи на Западе и в России. Нам теперь нужен такой президент"*.



ЗА ДУБКО - 6 %

Шестеро наших телефонных собеседников вспомнило о некогда президентских амбициях гродненского губернатора. Настроение этой группы опрошенных наиболее полно передает ответ одной из сторонниц Александра Иосифовича: *"Потому что он наш, а за Лукашенко не хочу, потому что у него страшные... замашки и он час хочет отдать России"*. То есть, некоторые гродненцы именно в А. Дубко видят спасителя суверенитета нашей страны.

ЗА ГОНЧАРА - 3 %

Трое гродненцев вспомнили о Викторе Гончаре. *"Это молодой, принципиальный, смелый и честный политик. Нам нужен президент с качествами европейского лидера, а не советско-совхозного быдла"* - ответила молодая поклонница председателя Центризбиркома.

ЗА БОГДАНКЕВИЧА - 2 % И ЗА ШЕРЕМЕТА - 2 %

Бывший первый банкир страны разделил пятую строчку в нашем рейтинге с самым известным белорусским журналистом. В пользу первого высказывались такие аргументы: *"Он смог в невероятно тяжелых условиях стабилизировать белорусский рубль, и я верю, что то же самое он сможет сделать со всей страной"*. Павел Шеремет должен быть благодарен президенту за свое присутствие в президентском рейтинге: *"Раз уж Лукашенко вывел его на политическую стезю, то пускай парень сделает карьеру и станет нашим президентом"*.

ТОЛЬКО НЕ ЗА ЛУКАШЕНКО - 23 %

Довольно большая группа опрошенных не смогла назвать желаемого кандидата в президенты, ограничившись утверждением, что в любом случае им не станет действующий президент. *"За Лукашенко - никогда. Нет к нему доверия. Какой же это президент, если он не позаботился о том, чтобы я - инвалид второй группы, могла купить себе в аптеке элементарные лекарства. Когда я смотрела по телевизору, как он ругал своего министра, то у меня сложилось впечатление, что они договорились. Лукашенко сказал ему: "Я тебя буду ругать, чтоб все видели, а ты молчи". И тот молчал и до сих пор - министр. И оба довольны. Так вот они нас и обманывают"* - заявила одна из бывших сторонниц президента. Впрочем, мотив отсутствия доверия к Александру Григорьевичу являлся основным аргументом представителей данной группы наших респондентов. Следовательно, так называемый "протестный" электорат, может стать подспорьем для любого оппозиционного кандидата. Входите в доверие уважаемые, но бойтесь его разбазарить в пользу своих противников.

НИ КОМУ НЕ ВЕРЮ, НИ ЗА КОГО - 17 %

Потерянная для политиков группа разочаровавшихся во всех и вся. Во многом эти люди своим пассивным отношением к политической жизни страны обязаны Александру Григорьевичу: *"Все одинаковые. Что мы видим от этого президента? Ничего! Остальные такие же будут"*.

Редакция "БИ" после долгого обсуждения не пришла к единому мнению по кандидатуре президента. В качестве компромисса был выбран ответ одного из наших респондентов, логику рассуждений которого и рекомендует "БИ" на любых выборах: "Я бы голосовал за Ванькова. Хлопец грамотный, честный, в банке работает. А главное, я его знаю, он не допустит, чтобы как при Лукашенко цены росли каждую неделю, а зарплаты хватало бы на два раза в магазин сходить".

А. ПЫТАЛЬНИК

ОПРОС, ЕЩЕ ОПРОС

Событие года по-российски

Только 9 процентов жителей России назвали важнейшим событием 1998 года подписание декларации о создании союзного государства с Беларусью. Об этом свидетельствуют опубликованные в российской газете "Новые известия" итоги опроса, проведенного Всероссийским центром изучения общественного мнения. Для сравнения: столько же процентов участников опроса - 9 - отметили в качестве важнейшего события года похищения людей в Чечне, 13 процентов - "сексуальный скандал" вокруг президента США Клинтона, 22 - деноминацию российского рубля в январе 1998 года, 25 – бомбардировку Ирака, 32 - убийство Галины Старовойтовой, 43 процента – финансовый кризис 17 августа.

БелаПАН

ГРОДНА

Развітанне з Міцкевічам

У Новым Замку працягваецца выстава "Геній краю вячыстай славы", прысвечаная жыццю і творчасці вялікага паэта. Такім чынам, кастрычніцкім адкрыццём цудоўнага помніка Адаму Міцкевічу і дадзенай выставай Гродна адзначыла юбілейны, двухсоты год з дня нараджэння нашага славутага земляка.

Стваральнікі выставы, дыпламатычна абышоўшы спрэчнае пытанне аб нацыянальнай прыналежнасці Адама Міцкевіча, прадставілі кампазіцыю, у якой адлюстраваны розныя перыяды жыцця паэта. На ёй прадстаўлены партрэт Міцкевіча работы Ч.Роя, копіі аўтографаў твораў, патыхае настроем таго часу ад старых кніжак прыжыццёвых выданняў, прадстаўлены таксама мэбля і іншыя прадметы побыту таго часу. Цікава, што барэльеф да стагоддзя паэта, які можна ўбачыць на выставе, выраблены на паўднёва-уральскім заводзе ў г. Каслі. Калі ж нарэшце нешта падобнае адальюць на Беларусі?

Год Міцкевіча ўжо скончыўся. На развітанне з паэтам у нас застаўся яшчэ тыдзень, на працягу якога будзе працаваць гэтая выстава.

Канцэрт у гонар Раства Хрыстова

Восьмага студзеня ў Новым Замку адбыўся святочны канцэрт. У выкананні хора "Гродзенская капэла" пад кіраўніцтвам Ларысы Іконнікавай прагучала духоўная музыка рускіх класікаў і сучасных гродзенскіх кампазітараў.

Шматлікім слухачам, якія сабраліся ў зале, святар гродзенскай епархіі айцец Аляксандр перадаў духоўнае віншаванне са святам. У сваёй прамове ён адзначыў, што "Гродна - невялікі па еўрапейскіх мерках горад, але яму ўласцівы высокі ўзровень духоўнай музычнай культуры".

Гарманічнае гучанне хора ў гэты вечар, дакладнасць перадачы задум аўтараў, добрая тэхніка выканання былі адзначаны вядомым гродзенскім кампазітарам Яўгенам Петрашэвічам. Як заўсёды бліскуча, па-майстэрску, дырыжыравала Ларыса Іконнікава. Слухачы праводзілі выканаўцаў авацыямі і доўга не хацелі разыходзіцца. У душы па-сапраўднаму мясцілася свята.

Г.КАНУННІКАЎ

ВОЛКОВЫСК

Снова с работой

С 3,41 до 2,92 процента снизился уровень безработицы в Волковысском районе за прошлый год. В центр занятости обратилось за это время 3534 человека, трудоустроены - 3254, в том числе на постоянную работу - 2215. 222 безработных, что были зарегистрированы в центре занятости, направлены на переобучение: 195 человек получили удостоверение об окончании учебы и новую специальность, 177 из них уже трудоустроены. В основном это - мужчины со специальностями "оператор газовых котельных", "газоэлестросварщик", "автослесарь".

М.ГАШИМОВ

ИВЬЕ

Не оскудеет рука...

Закончились новогодние праздники, но слышится отголосок тех добрых дел, которые были проведены во имя милосердия и человеческой поддержки.

Состоялся благотворительный утренник для детей-инвалидов, сирот, детей из социально незащищенных семей, а также для одаренных детей. Стало это возможным, благодаря коммерческим и государственным структурам: фирма "А2", координационный совет профсоюза, "Зернохимпродукт", Фонд мира, АО "Чабор", "Авеста", "Рилор", "Витязь", "Верас", "Триампо", "Нефтехимпродукт", БПСМ и ряд других. Инициативную группу по проведению благотворительной акции возглавил зам. председателя райисполкома. Исполком организовал также поздравление по месту жительства детей воинов-интернационалистов, детей-инвалидов. Пятнадцать подарков совместно с областной Ассоциацией воинов-интернационалистов преподнес афганцам и семьям погибших воинов хозяин частного магазина "Афганец" Степан Иванович Даниленко. Прекрасно, что не скудеет мир на добрых людей, которые готовы, посочувствовать, помочь, спасти.

Показатель благополучия

За 1998 год предприятиями района на экспорт отгружено продукции на сумму 799,9 тысяч долларов США, импорт составил 144 тысячи долларов. Превышение экспорта над импортом всегда считалось показателем благополучия.

В.ГУЛИДОВА

МФК

На финишной прямой

С наступлением 1999 года в завершающую стадию вступила реализация проекта Международной финансовой корпорации (МФК) "Поддержка частного предпринимательства в Беларуси". По информации руководителя проекта Карла Дагенхарта, на заключительном этапе, который продлится до июня 1999 года, будет продолжено оказание помощи в развитии бизнес-центров в Бресте и Гродно. Основной целью такой поддержки МФК является вывод бизнес-центров на самофинансирование и самостоятельную работу по предоставлению предпринимателям информационных, образовательных и консалтинговых услуг.

По словам К.Дагенхарта, в наступившем году планируется организовать подготовку консультантов по бизнес-планированию в каждом регионе Беларуси.

БелаПАН

Коллектив проиграл, бюджет выиграл

В Волковыске прошел 35-й городской аукцион по продаже объектов коммунальной собственности. Торги были подготовлены Волковысским горисполкомом при техническом содействии проекта Международной финансовой корпорации (МФК) "Малая приватизация в Беларуси", финансируемого Агентством США по международному развитию.

На последние торги в уходящем году был предложен только один лот: действующее предприятие - ГТП "Электротовары" общей площадью 315,4 кв.м, начальная цена продажи 1935 млн.руб. Объект выставлялся с условиями: сохранение профиля объекта не менее 5 лет, сохранение числа рабочих мест и трудовых отношений с членами трудового коллектива сроком не менее 2-х лет. На участие в аукционе было подано три заявки, одна из них была подана трудовым коллективом. В результате торгов цена на торговое предприятие выросла до 4 млрд. 27 млн. руб. Трудовой коллектив не смог продолжить аукционные торги до конца. Победителем стало юридическое лицо г. Волковыска. Полученные от продажи объекта средства в размере 4 млрд. 27 млн. рублей поступят в городской бюджет.

Оживленные торги

В Гродно прошел городской аукцион по продаже объектов коммунальной собственности. Торги были подготовлены управлением коммунального имущества Гродненского горисполкома при техническом содействии проекта МФК.

38 аукцион оказался гораздо более интересным, по сравнению с предыдущим, и по количеству участников, и по вырученным от продажи денежным средствам. Объекты бытового обслуживания всегда привлекали особое внимание потенциальных покупателей. На аукционе к продаже предлагались объекты горбыткомбината: одна фотография, четыре парикмахерских, портретно-керамическая и зеркальная мастерские. По всем объектам, кроме зеркальной мастерской, выставлялись права аренды.

На участие в торгах по вышеназванным объектам было подано 19 заявок. На участие в торгах по парикмахерской №6 было подано 4 заявки. При начальной цене продажи 53 млн.руб., трудовой коллектив купил этот объект за 1 млрд.100 млн.руб. За эту же цену была приобретена парикмахерская №17 при начальной цене продажи 21 млн.руб.), но трудовой коллектив данного предприятия не смог до конца продолжить торги. Парикмахерская №27 была снята с торгов при наличии одной заявки. Цена продажи парикмахерской №32 выросла в 41, 4 раза и составила 290 млн.руб. На участие в торгах по фотографии №6 было подано 2 заявки, цена продажи составила 55 млн.руб. Портретно-керамическая мастерская была продана за 270 млн.руб. За зеркальную мастерскую сражалось три заявителя при начальной цене продажи 615 млн.руб. В результате торгов объект был продан в собственность за 2 млрд. 100 млн.руб.

Победителями на аукционе стали юридические лица. Парикмахерские №6 и №32 стали собственностью трудовых коллективов.

Вырученные от продажи объектов деньги в размере 4 млрд. 915 миллионов рублей поступят в городской бюджет.

Голландский аукцион

В Гродно на голландском аукционе по методу понижения начальной цены продавались 2 объекта: незавершенное строительство амбулатории Минойтовского объединения межрайагропромтехники и незавершенное строительство экспериментального участка по производству кухонной мебели ГГПП "Свитанак".

Было продано незавершенное строительство экспериментального участка по производству кухонной мебели за минимальную цену продажи 2 млрд. 307 млн. 400 тыс. рублей.

БРЕСТ

Венок на память

"Комитет защиты Отечества не допустит оккупации и колонизации Беларуси" — такова основная идея петиции, которая 11 января была официально передана группой брестчан генеральному консулу Российской Федерации в Бресте Борису Родимову. Авторы петиции заявляют "решительный протест" в связи с подписанием президентами России и Беларуси 25 декабря декларации о дальнейшем единении двух государств. "Введение общего таможенного пространства и общей валюты означает ликвидацию экономической независимости Республики Беларусь, — говорится в документе, — а совместная охрана границы Республики Беларусь является основанием для введения на территорию Республики Беларусь оккупационной российской армии". Следует отметить, что передача петиции генеральному консулу России в Бресте — не единственная акция протеста против белорусско-российского объединения, которая прошла в областном центре. В декабре, сразу же после подписания названной декларации, российскому консулу был вручен погребальный венок с надписью "Вечная память дружбе России и Беларуси".

Валентина КОЗЛОВИЧ, БелаПАН

ГРОДНО

Новая ставка "Азота" на свои деньги

На гродненском производственном объединении "Азот" освоен выпуск ценного химического сырья — метанола. Он широко используется при производстве сотен видов химической продукции, среди которых — клей, синтетические волокна, формальдегид и многие другие. Выпускавшие их белорусские предприятия вынуждены были импортировать метанол. Теперь возможности "Азота" позволяют полностью обеспечить потребности в нем отечественных производителей. Всего же планируется выпускать 55 тысяч тонн этого ценного химического продукта в год. Новое производство было налажено за собственные средства предприятия, а это — 1,5 миллиона долларов, которые, по самым скромным подсчетам, окупятся за два года. В то же время, ежегодная экономия валюты для страны составит примерно в пять раз большую сумму. В первую очередь, метанол будет отгружаться новополоцкому заводу "Полимир", могилевскому объединению "Химволокно" и "Белтрансгазу". Не исключена также его поставка на экспорт.

БелаПАН

Заявление по вопросу объединения РБ и РФ

предпринимательских структур

В конце 1998 года президентом РБ вместе с президентом Российской Федерации подписаны документы, говорящие о намерении создать единое государство. Анализ этих документов, а также более чем 2-х часового теле интервью президента РБ показывает, что даже сам президент еще не разобрался, что это будет за объединение. Никому не понятно, что это за государство, которое будет состоять из двух суверенных государств.

Сами подписанные документы скорее похожи на декларации о намерениях, в принципе, ни к чему не обязывающие.

Возникает вопрос: зачем это нужно? Очевидно, доведя страну до полного разорения и изоляции на международной арене, президент РБ А.Лукашенко в который раз разыгрывает российскую карту, эксплуатируя ностальгические воспоминания некоторой части граждан бывшего Советского Союза по временам единого государства. Подписанные документы можно рассматривать как стремление президента РБ уйти от ответственности за результаты своей деятельности на посту президента перед собственным народом, а при определенных условиях, стать президентом единого государства, тем самым утопив все созданные им проблемы вместе с суверенитетом Беларуси в большом российском болоте.

Мы, представители предпринимательских структур РБ, заявляем, что мы за дружбу с братским русским народом, но мы против объединения двух государств с разрушенной экономикой и нищими гражданами, такое объединение ничего хорошего не даст. Мы считаем, что быстрее можно навести порядок в своей небольшой квартире РБ, чем в заброшенном и неухоженном поле, в которое нас хотят завести президент. Кроме того, в масштабе РБ все большему и большему числу граждан, несмотря на ораторские способности президента, становится ясно, что путь, который выбрал президент, ведет к полной экономической разрухе, международной изоляции и потере суверенитета РБ. Похоже, и сам президент начинает понимать это. Начинает понимать, что рано или поздно придется ответить перед своим народом за все, что обещал сделать и не сделал, ищет выход из тупика, в который завел белорусский народ.

Мы за независимость РБ и против использования суверенитета РБ, как разменной монеты в политических играх президента А.Лукашенко.

Принято единогласно.

г.Минск, 6 января 1999 года.

Акция протеста

На 27.01.99 г. (среда) планируется однодневная общереспубликанская акция протеста. Все рынки Республики Беларусь в этот день прекращают работать. В Минске 27 января пройдут крупномасштабные митинги и акции протеста, организованные рабочими, профсоюзами, предпринимателями.

ПРАЦЯГ ТЭМЫ

“Без яе музей асірацее...”

Тое, як абышліся гродзенскія абласныя ўлады з вядомай беларускай паэткай, дырэктарам лепшага ў Беларусі музея М.Багдановіча ўсхвалявала нашых чытачоў. Нагадаем, што ў мінулым нумары нашай газеты мы паведамілі аб звальненні Дануты Бічэль-Загнетавай з пасады дырэктара музея М.Багдановіча ў Гродне, які яна практычна адна на пустым месцы стварыла ў Гродне. Лісты чытачоў не заставілі сябе доўга чакаць.

Дарэчы, мы былі б вельмі ўдзячны Упраўленню культуры аблвыканкама, каб тыя, хто выклікаў абурэнне ў гродзенцаў, патлумачылі на старонках нашай газеты сваю пазіцыю.



Лісты чытачоў

Даведаўся з вашай газеты пра звальненне з музея Максіма Багдановіча яго заснавальніцы Дануты Бічэль-Загнетавай. Гэтая акцыя, а таксама спосаб яе правядзення, выразна паказваюць пагардлівыя адносіны абласных уладаў да беларускай культуры ўвогуле і да яе выбітных прадстаўнікоў у прыватнасці. Данута Бічэль-Загнетава - гонар нашага горада, асоба з вялікім маральным аўтарытэтам. Выгнаўшы з працы дырэктара ўнікальнага музея, паэтку, якая стварыла і падтрымлівала ў ім атмасферу беларускага генія, кіраўнік вобласці Дубко, а таксама "вертыкальшчыца ад культуры" Кадзевіч парушылі элементарныя маральныя нормы, уласцівыя прыстойным людзям, супрацьпаставілі сабе гарадзенскую інтэлігенцыю. Перакананы, што асобы, учынiўшыя такія дзеянні, абавязкова будуць караныя людскім судом, калі не крымінальным, то маральным без часу даўнасці.

Алесь Краўцэвіч, гісторык.

Дзякуй Вам, Данута Янаўна

Гісторыю Беларусі твораць паэты. Бо Беларусь - гэта не краіна (краіна -РБ). Беларусь - гэта мара. Усё яшчэ незбытная. І сёння да яе мо далей, чым калі-небудзь. А хто ўмее марыць так, як паэты?

Гароднял - гэта яе паэзія, гэта яе каханне, гэта прытулак яе душы. І гэта яе шматдзённая, шматгадовая праца. Менавіта з імем Дануты Янаўны звязана ўяўленне пра наш горад кожнага беларуса. І сёння. І заўтра. І ніколі - з тым, хто тут сёння правіць баль. Бо кожная беларуская ўлада - з'ява часовая. Як пыл, што хавае скарб. Пакуль не знойдуцца тыя, што прыбяруць яго. Хто сёння памятае імёны тых, што імкнуліся абразіць, знішчыць Купалу, ганьбуючы ўсё, што было святым для яго? А імя паэта ведае кожны, нават спрадвечныя ворагі Беларушчыны, каго сёння на Беларусі - процьма.

Сапраўдным прытулкам Беларушчыны стаў у нашай Гародні музей Максіма Багдановіча. Музей, якім можа ганарыцца наш горад. Дзесяткі гадоў аддала яму Данута Янаўна, каб стварыць яго. Дзякуй Вам!

Няма больш месца для Дануты Янаўны ў гэтым музеі... Для гаспадыні няма месца ў яе доме. Але гэта - часова. Бо час Дануты Бічэль-Загнетавай не мінуў. Ён яшчэ не прыйшоў...

Ала Петрушкевіч, выкладчык кафедры беларускай літаратуры ГрДУ.

Без яе музей асірацее

Без перабольшвання можна сказаць, што музей знакамітага песняра М.Ьагдановіча заўсёды ўспрымаўся неяк паўней, калі яго дырэктарам працавала сучасная беларуская паэтэса Данута Бічэль-Загнетава. Пераступаючы парог гэтага будынка, заўсёды чакалася, што цябе сустрэне ветлівай усмешкай яна, спадарыня Данута. Усё афармленне музея, яго цікавыя экспанаты зберагаюць у сабе цеплыню яе гарачага сэрца і працавітых рук.



З асабістага досведу ведаю, што шмат якія рэчы, якія характэрызуюць дух Максімавай эпохі, з'явіліся ў музеі дзякуючы руплівасці і настойлівасці дырэктаркі. І як тут не ўзгадаць нібы другое аддзяленне музея: "Літаратары Гродзеншчыны". Тут шмат цікавых рэчаў, фотаздымкаў, гэтага асяродку нацыянальнай культуры ў Гродне, знакамітай беларускай паэткай Данутай Бічэль-Загнетавай. З пункту гледжання права тут праблем не ўзнікае. Справа ў тым, што Данута Янаўна чалавек пенсійнага ўзросту, але па сутнасці гэты факт у выніку прывядзе да значных стратаў у духоўным жыцці нашага кніжак паэтаў і пісьменнікаў, якія пачыналі свой творчы шлях на Гарадзеншчыне, а сёння ўжо няма іх сярод нас. І зноў жа, дзякуючы ахвярнасці непаседлівай дырэктаркі, яны прамаўляюць да нас, як жывыя.

І вось, нібы гром з яснага неба, даведваемся з вашай газеты, што Данута Бічэль-Загнетава ўжо не дырэктар. Чаму, чым загадам яе адарвалі ад гэтай творчай працы, якая так патрэбна была не толькі тым, хто шануе і любіць М.Багдановіча, але і ўсім жыхарам Панямоння, а дакладней - усім беларусам, сынам гэтай зямлі.

Алесь БАРКОЎСКІ, жыхар Гродна.

Вопыт усіх краінаў падказвае...

Як стала вядома грамадскасці, Упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама не падпісала кантракт на прадаўжэнне працы ў якасці дырэктара дома-музея М.Багдановіча са стваральніцай горада. Вопыт усіх краінаў, у прыватнасці нашай усходняй суседкі Расіі паказвае, што дамы-музеі пісьменнікаў, паэтаў, знакамітых людзей могуць добра пачувацца, прыносіць карысць духоўнаму адраджэнню народа толькі тады, калі на чале іх стаяць людзі таленавітыя, духоўна багатыя, якія глыбока і тонка разумеюць і адчуваюць ролю спадчыны паэта ў духоўным жыцці нацыі. Прыкладам, які падцвярджае гэтую думку, з'яўляецца знакаміты дырэктар і стваральнік музея-запаведніка А.С.Пушкіна ў Міхайлаўскім спадар Гельчанка.

Мне здаецца, што менавіта такую ролю ў стварэнні дома-музея М.Багдановіча адыграла Данута Бічэль-Загнетава. І я звяртаюся да кіраўніцтва Упраўлення культуры аблвыканкама вярнуцца да гэтага пытання, бо ўпэўнены, што менавіта гэта той самы выпадак, калі паўнацэннай замены Данупе Янаўне немагчыма знайсці. Гэта вынікае з адметнасці спецыфікі дома-музея М.Багдановіча, як асяродка культуры.

С.ГАБРУСЕВІЧ, старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Беларускага фонду культуры.

Хамства калі-небудзь скончыцца...

Мы жывём ў дзікунскай краіне. У нас заўсёды робіцца не так, як у нармальных людзей. Чыноўнікі, пастаўленыя на высокія пасады, робяць свае справы зусім у супрацьлеглым кірунку, чым гэта павінна быць. Яшчэ адзін доказ гэтаму - непадпісанне кантракту на далейшую працу з дырэктарам дома-музея М.Багдановіча паэткай Данутай Бічэль-Загнетавай. Такі ўчынак Упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама можна расцэньваць толькі, як антыкультурны, антычалавечы. Што можна яшчэ дадаць да такога хамства? Толькі адно. Калі-небудзь настане канец нават і такому хамству.

А.БРУСЕВІЧ, студэнт.

ПРАБЛЕМЫ МОВЫ

Мы - за класіку

У снежні ў Празе адбылася нарада карыстальнікаў класічнага беларускага правапісу

Нагадаем, што так званая "тарашкевіца" была афіцыйным правапісам на Беларусі да 1933 г., калі Савецкая ўлада "з мэтай набліжэння беларускай мовы да рускай" (аб чым зусім адкрыта заяўлялася) "рэфармавала" правапіс. Пры гэтым штучна былі скасаваныя шмат якія з асаблівасцяў ранейшай мовы.

Класічны правапіс, тым не менш, не быў забыты і яго развіццё, у прыватнасці, беларускай эміграцыяй, працягвалася. На сённяшні ж дзень наспела неабходнасць некаторага рэфармавання і унармавання "тарашкевіцы", і пачатак гэтай справе паклала вышэйзгаданая нарада. У яе працы прымалі ўдзел: з Нью-Ёрку - Лявон Юрэвіч, з Вільні - Сяргей Шупа, з Беластоку - Ян Максімюк, з Прагі - Сяржук Сокалаў, Ю. і В. Станкевічы ды журналісты радыё "Свабода", з Менску - Вінцук Вячорка, Пётра Садоўскі, Ул. Цыхун, Зміцер Санька, Ала Сакалоўская, Сяргей Дубавец і Уладзімір Арлоў.

Глеб КАНУННІКАЎ

ПАДАРОЖЖЫ

На аўдыенцыі ў Рымскага папы

У панядзелак студэнт аддзялення класічных моваў і антычнай літаратуры Мікола Вішнеўскі здаў на пяцёрку экзамен па лацінскай мове. Перад гэтым ён наведаў "вечны горад", калыханку лацінскай мовы - Рым.

З 28 снежня па 1 студзеня ў Мілане праходзіла спатканне каталіцкай моладзі Еўропы, на якім была таксама і дэлегацыя з Гродна. Акрамя Мілану моладзь наведала яшчэ Рым, Венецыю і Ватыкан, дзе гродзенскую дэлегацыю прыняў на аўдыенцыі Папа Рымскі.

- Мікола, раскажы, дзе праходзілі спатканні ў Мілане?

- У суперсучасным будынку-комплексе "Сьера дэ Мілано", дзе звычайна праходзяць выставы, прысвечаныя найноўшым адкрыццям у розных навуках - фізіцы, хіміі.

- А чым вы займаліся?

- Спявалі песні, супольна маліліся.

- Ці пазнаёміліся вы з еўрапейскай моладдзю?

- Так, мы займаліся разам з палякамі, немцамі ды італьянцамі.

- Ці ведаюць яны штонебудзь пра Беларусь?

- Нешта ведаюць, але надта цьмяна. У сям'і, дзе я жыў, маці прынесла італьянскі падручнік для 5-га класа, знайшла на мапе Беларусь і паказала мне. "Тут?" - запыталася. - "Так", - адказваў я.

- Дарэчы, на якой мове вы размаўлялі, калі жылі ў сем'ях?

- Па-англійску і на пальцах.

- А моладзь з Гродна на якой мове паміж сабой размаўляла?

- Па-руску, ясна. Па-польску - з нацяжкай. Калі мы выязджалі з Рыму, у аўтобус зайшла жанчына з радыйным магнітафонам і запыталася, хто размаўляе па-беларуску. Адзін я адказаў. Яна задала мне некалькі пытанняў. Дарэчы, сама яна вельмі добра гаварыла па-беларуску, без усялякага акцэнту.

- Раскажы, дзе праходзіла аўдыенцыя.

- Аўдыенцыя была ў будынку ватыканскай бібліятэкі. Папа прывітаў нас па-польску. Спатканне цягнулася хвілін 15. Пасля на развітанне ўсе цалавалі папскі сыгнет.

- Ці бачыў папскую гвардыю?

- Бачыў - працуюць. Яны вельмі сур'ёзна ставяцца да сваіх абавязкаў.

- Як вы сустракалі Новы год?

- У так званай араторыі. Гэта такое памяшканне каля касцёла, дзе парафіяне бавяць вольны час. Там можна не толькі пасядзець і паспяваць, але і пагуляць, напрыклад, у настольны тэніс.

Кожная дэлегацыя павінна была падрыхтаваць і праспяваць якую-небудзь песню. Віно ды шампанскае таксама было, але італьянцаў гэта не надта цікавіла. Віно там не дыфецыт.

- А чым вас кармілі?

- У асноўным кансервамі ды спагецці. У сем'ях частавалі піцай.

- А як табе Венецыя?

- Звычайна.

- Ну ні што сабе! Раскажы пра каналы, ці яны не замярзаюць узімку, і ці залівае вадою пляц св.Марка.

- Каналы не замярзаюць. Мы пераплывалі на гандоле з аўтобуснай стаянкі ў стары горад. Былі ў палацы Дожаў, на пляцы св.Марка таксама былі (ён абсалютна сухі). Як заўсёды - шмат галубоў. На пляцы спецыяльна прадаецца кукуруза, каб іх карміць. Турысты звычайна купляюць, але ў нас не было часу.

- Ці шмат на вуліцах гуляе катоў?

- Катоў няма - ёсць бамжы. Увогуле Рым спадабаўся мне больш за Мілан, які надта сучасны. Дарэчы, падчас пабыту ў Рыме мы жылі ў Доме пілігрыма, дзе законныя сёстры на абед частавалі нас белым віном.

Гутарыла Інга Астраўцова


Каложская царква і манастыр

Страчаная спадчына


(Працяг.
Пачатак у папярэднім нумары)

Брэсцкая ўнія была прынята ў Гродне без асаблівага (згодна з гістарычнымі крыніцамі) супраціву. Таму ўжо напачатку XVII ст. праваслаўны Каложскі манастыр стаў мужчынскім уніяцкім базыльянскім. Аднак, нягледзячы на шматлікія фундацыі ў грашовым і зямельным эквіваленце, у XVII-XVIII ст. манастыр разам з храмам знаходзіліся ў запусценні. Прычынамі такога становішча было тое, што Гродна ў сярэдзіне XVII ст. было спустошана маскоўскімі і шведскімі войскамі, а напачатку XVIII ст. - войскамі цара Пятра I, які больш за іншых ненавідзеў уніятаў (у гістарычных крыніцах даволі падрабязна апісана як Пётр I і Меншыкаў асабіста закалолі шпагамі дзесятак бяззбройных манахаў-базыльянаў у акупаваным Полацку).

Зрэшты Каложская царква абустройвалася. Галоўная падзея XVII ст. - у іканастасе царквы паявілася галоўная святыня гродзенскіх уніятаў - ікона Божай Маці Каложскай. Дарэчы, пасля 1839 года гэта ікона шанавалася і праваслаўнымі. Ікона, па сцвярджэнню мастацтвазнаўцаў, была напісана напачатку XVII ст. па заказу настаяцеля манастыра, магчыма ў Супраслі. Яе культ стаў асабліва масавым у другой палове XVII ст. пасля шведскага патопа і маскоўска-казацкай акупацыі. Падчас страшнай эпідэміі, якая ахапіла практычна ўсю Беларусь напачатку XVIII ст., культ іконы стаў рэгіянальным, так як Каложская Божая Маці "рабіла цуды", ратуючы людзей ад смерці. Ва ўсякім выпадку, неафіцыйна, Каложская Божая Маці да 1915 года была галоўнай іконай праваслаўных Гродзенскага рэгіёна і знаходзілася ў іканастасе храма новага Барысаглебскага праваслаўнага мужчынскага манастыра, які пасля 1852 года мясціўся ў будынку былога жаночага бернардынскага кляштара (на месце, дзе зараз знаходзіцца абласны тэатр). Улічваючы значэнне іконы, яе ў 1915 годзе вывезлі ў эвакуацыю ў Маскву... Пазней была рэвалюцыя, потым без поспеху яе спрабавалі вярнуць на радзіму ў 1921-29г.г. Цяпер наша святыня знаходзіцца ў запасніках аднаго з крамлёўскіх музеяў, але пакуль Дзярждума Расіі настойвае на тым, што "все, что у нас хранится чужое - возврату не подлежит", нам не відаць Цудатворнай Каложскай Божай Маці, як сваіх вушэй.



Малюнак-схема катастрофы 1853 года з паўднёвага боку. 1857 год.



Малюнак інтэр'ера Калоскай царквы. 1850 (?) год. Мастак В.Герсон.

Непадалёку ад паўднёвага фасада Барысаглебскай царквы некалі знаходзіліся могілкі (іх можна ўбачыць на гравюры Цюндта-Адэльгаўзера XVI ст. і на гарвюры Т.Макоўскага 1600 года). Нашы продкі былі людзьмі прадбачлівымі і добра ведалі аб разбуральным уздзеянні Нёмана і іншых прыродных фактараў на такія важныя забудовы ў Гродне, як "Domus Regia" - тэрыторыя Новага Замка, Старога Замка і Каложы. На гравюры Цюндта, добра відаць як мудрагелістымі канструкцыямі з дубу ўмацоўвалі бераг "Domus Regia". Гравюра Макоўскага адлюстравала цікавае вынаходніцтва продкаў - уздоўж Нёмана ў гарадской мяжы быў узведзены драўляны плот, які захоўваў бераг падчас паводкі.

Аднак палітычныя лёсы горада перакрэслілі ўсе планы нашых продкаў - пра ўмацаванне берага забыліся, паколькі гарадская казна была пустая (войны і нашэсця XVII-XVIIIст.) і бераг пад Каложай пачаў асыпацца. Ужо напачатку XVIII ст. у рэку асунуліся старажытныя могілкі і манастырскія забудовы, а да 1720 года становішча царквы знаходзілася пад сур'ёзнай пагрозай настолькі, што аб ім загаварылі паслы (Рыгор Катовіч і Зыгмунт Валь) на чарговы Сейм. Цікава, што нягледзячы на неверагодную занятасць, вайсковы інжынер войскаў Касцюшкі ў Гродне (на жаль, невядома яго прозвішча) правёў агляд і абмеры Каложскай царквы, аб чым і напісаў у артыкуле падпісаным ініцыяламі ў адным з лонданскіх выданняў. Гэты інжынер прапанаваў неверагодна просты і адначасова ўнікальны спосаб устаноўкі плаваючага маста са звычайных броўнаў, па якому ў вусце рэчкі Ласосна паўстанцы вывезлі сваю артылерыю.

Да прыняцця імператарскага ўказа аб ліквідацыі Уніі ў 1839 годзе, Каложскі манастыр знаходзіўся ў поўным запусценні. Сур'ёзны абвал берага ў раёне Каложы адбыўся ў 1842 годзе, а настаяцель напісаў свайму кіраўніцтву ў Сант-Пецярбург і Вільню наступнае: "храм этот ценности особой не имеет...". У 1845 годзе бераг абваліўся настолькі, што патрэбна было нешта абавязкова рабіць. Зрабілі! Намаганнямі настаяцеля ў 1852 годзе мужчынскі Барысаглебскі манастыр пераехаў у будынак ліквідаванага каталіцкага жаночага кляштара бернардынак. Трэба сказаць - пашэнціла. 1 красавіка (па старому стылю) 1853 года адбыўся першы абвал берага, пасля якога адбылося разбурэнне храма. Тады ў Нёман асунулася большая частка паўднёвага фасада і частка заходняга... Чыноўнікі пісалі лісты і пісалі шмат..., у 1884 годзе ў Нёман звалілася частка апсіды храма.

У Пецярбургу, як высветлілася, ў той час у адным з Дэпартаментаў працавалі інтэлігентныя людзі, якія ўзялі на сябе ініцыятыву ўратаваць сімвал праваслаўя на заходніх межах імперыі. У 1876-1910 гадах былі праведзены шырокія геалагічныя, інжынерныя і архітэктурныя даследаванні Каложскай царквы і берага Нёмана. Аднак планам вяртання Каложы да жыцця перашкодзіла Першая Сусветная вайна, а затым рэвалюцыя.

З 1920 года Каложская царква аказалася пад юрыздыкцыяй новых уладаў - польскіх. Нягледзячы на асобныя вострыя моманты, звязаныя з вяртаннем маёмасці католікам, у цэлым праваслаўе на тэрыторыі Заходняй Беларусі не прыціскалася. Больш таго, у межах вяртання культурных каштоўнасцяў, з тэрыторыі Савецкага Саюза на тэрыторыю Заходняй Беларусі былі вернуты многія праваслаўныя рэліквіі. Нягледзячы на высілкі Я.Ядкоўскага, як ужо ўзгадвалася вышэй, цудатворную ікону Каложскай Божай Маці вярнуць не ўдалося. Але



Цудатворная ікона Каложскай Божай Маці. Пач. XVII ст. Зараз захоўваецца ў запасніках аднаго з Крамлёўскіх музеяў.

польскія ўлады горада надавалі Каложы вялікае значэнне. Былі праведзены археалагічныя раскопкі, напісана манаграфія, шматлікія артыкулы. У 1934 годзе, пасля таго як на сценах храма з'явіліся шматлікія трэшчыны, быў створаны Камітэт па спасенню Каложскай царквы. Галоўная заслуга гэтага Камітэта - запрашэнне для правядзення геалагічных даследаванняў берага Каложы аднаго з лепшых спецыялістаў таго часу - прафесара Браніслава Галіцкага. Ён адшукаў мелавую лінзу ў



Вельмі рэдкі здымак інтэр'ера Каложскай царквы пасля катастрофы 1853 года.

падножжы гары не адзначаную ў час расійскіх геалагічных даследаванняў, якая з'яўлялася прычынай разбурэння храма.

Гісторыя Каложскай царквы ў савецкі перыяд даволі сумная, за выключэннем невялікага адрэзку часу, калі храм знаходзіўся пад юрыздыкцыяй Рэспубліканскага музея Атэізма і гісторыі рэлігіі. Менавіта тады былі праведзены першыя археалагічныя даследаванні храма, частковая яго рэстаўрацыя, стараннямі Аляксея Карпюка напалову легальным шляхам быў вернуты з Вільні Каложскі Вадалей. Тады ж пачаліся комплексныя даследаванні храма, якія праводзіў, цяпер ужо нябожчык, архітэктар Слюнчанка - лепшы знаўца гісторыі і архітэктуры храма, а пасля яго смерці - Вадзім Глііннік.

Аб гэтым размова пойдзе ў наступным нумары.

Ігар ТРУСАЎ, гісторык архітэктуры.
Усе здымкі выкарыстаны з асабістага архіва І.ТРУСАВА.



Абмерны малюнак заходняга фасаду Каложскай царквы, зроблены ў 1857 годзе.



Абмерны малюнак паўднёвага фасаду Каложскай царквы, зроблены ў 1857 годзе.

ПАПРАЎКА

У першай частцы нашага артыкула аб Каложскай царкве, на жаль, намі была дапушчана прынцыпова важная апячатка ў тэксце. Канешне ж, у самім Гродне жылі славяне, а не яцвягі, яцвягі жылі ў ваколіцах Гродна. І безумоўна, заходнеславянскія плямёны мазураў складалі толькі вельмі нязначны працэнт насельніцтва ваколіцаў Гродна. Прыносім прабачэнне.

Случаи Происшествия Преступления

Больные воруют у больных

Переносной телевизор "Верас" украл из незапертой соседней палаты, находящийся на излечении в гродненском тубдиспансере, ранее судимый житель нашего города. Таким образом он решил совместить лечение со старой привычкой. Такой же больничный воришка был задержан и в Свислочской районной больнице, им оказался ранее судимый 27-летний бомж. У соседей по палате он украл 500 тыс. белорусских рублей. Оба задержанных сменили больничную палату на камеру следственного изолятора.

Молодые обижают стариков

Забрали деньги и избили 73-летнего жителя деревни Быховичи Кореличского района двое молодых односельчан. Хулиганы совершили преступление после того, как распили в доме пострадавшего значительное количество спиртного. Оба хулигана задержаны. На ул.Домбровского в Гродно пенсионера также обидел молодой человек: пробегая мимо подвыпившего старика, он выхватил у него кошелек, в котором находился 1000000 бел. рублей. По описаниям потерпевшего сотрудниками милиции был задержан 16-летний неработающий гродненец.

Студенты крадут магнитолы

